9. ГАРФ. – Фонд А353. – Оп. 2. – Д. 696. – Л. 216.
10. ГАРФ. – Фонд А353. – Оп. 2. – Д. 696. – Л. 216.
11. *Стволыгин, К. В.* Роль Объединенного совета религиозных общин и групп в становлении института альтернативной службы в советском государстве / К. В. Стволыгин // Научные труды республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст.: в 2 ч. – Минск: РИВШ, 2014. – Вып. 14, ч. 1. – С. 261–267.
12. *Клибанов, А. И.* Религиозное сектантство и современность (социологические и исторические очерки) / А. И. Клибанов. – М.: Наука, 1969. – 272 с.
13. Гражданская война и военная интервенция в СССР: энциклопедия. – М.: Сов. энцикл., 1987. – 720 с.
14. ГМИР. – Фонд 3. – Оп.1. – Д. 105. – Л. 1.
15. ГМИР. – Фонд 3. – Оп. 1. – Д. 125. – Л. 1.

**(Дата подачи: 15.02. 2017 г.)**

*К. В. Сыцько*
Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск

*K. Sytsko*
Institute of History of NAS of Belarus, Minsk

**УДК 930.2:27**

# ДАКУМЕНТЫ ПАРАФІЯЛЬНЫХ АРХІВАЎ РЫМА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА НА БЕЛАРУСІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ)

# DOCUMENTS PARISH ARCHIVES THE ROMAN CATHOLIC CHURCH IN BELARUS (FOR EXAMPLE THE GRODNO REGION)

*У артыкуле аўтар на прыкладзе даследаваных ім гістарычных крыніц, якія знаходзяцца на захаванні ў парафіяльных архівах Рыма-каталіцкага Касцёла на Беларусі, разглядае фактары, якія паўплывалі на цяперашні стан выяўленых дакументаў, а таксама робіць іх першасную класіфікацыю.*
*Ключавыя словы: крыніцазнаўства; мікрагісторыя; класіфікацыя; канфесійныя архівы; канфесійная гісторыя; Рыма-каталіцкі Касцёл.*

*In the article author considered the factors that have influenced the current state of the historical sources, preserved in the parish archives of the Roman Catholic Church in Belarus, and works out their initial classification.*
*Key words: source criticism; microhistory; classification; confessional archives; confessional history; The Roman Catholic Church.*

З атрыманнем Беларуссю незалежнасці айчынная гістарычная навука перажыла істотныя змены, у выніку чаго развіццё атрымалі новыя кірункі гістарыяграфіі. Сярод дадзеных кірункаў можна вылучыць мікрагісторыю, гісторыю паўсядзённасці, гендарную гісторыю, гісторыю ментальнасці, канфесійную гісторыю і інш. У гэтым кантэксце актуалізуецца пытанне

пашырэння крыніцазнаўчай базы і ўвядзення новых гістарычных крыніц у навуковы абарот.

Адным з комплексаў дакументаў, які можа праліць святло на шмат якія факты канфесійнага і паўсядзённага жыцця на Беларусі, з'яўляюцца крыніцы, якія ствараліся ў дзейнасці парафіяльных і філіяльных культавых устаноў Рыма-каталіцкага Касцёла на Беларусі ў XVIII–XX стст. і захоўваюцца ў парафіях на дадзены момант.

Гісторыя ўтварэння дадзеных гістарычных крыніц, а таксама аналіз іх інфарматыўнай вартасці мала даследаваныя ў айчынным крыніцазнаўстве, і, як вынік, прадстаўлены адзінкавымі, спарадычнымі артыкуламі, якія, па-сутнасці, з'яўляюцца простай канстатацыяй факта існавання ў некаторых рыма-каталіцкіх парафіях, роўна як і ў праваслаўных прыходах, дакументазбораў і спробай іх архіўнага апісання [1–4].

Разам з тым нельга не адзначыць важнасць гэтых дакументаў у гістарычных даследаваннях. Падчас археаграфічнай экспедыцыі, праведзенай у 2015–2016 гг. па заходняй частцы Беларусі, быў выяўлены і прааналізаваны багаты матэрыял архіваў касцёлаў Уздзвіжання Святога Крыжа ў г. Ліда, Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішчална, Найсвяцейшай Тройцы ў в. Струбніца (фактычна знаходзіцца ў в. Плябанаўцы Мастоўскага раёна, аднак адносіцца да в. Струбніца таго ж раёна. – *К. С.*), Святога Станіслава ў в. Ляцк, Святой Тэрэзы Авільскай у г. Шчучын, Унебаўзяцця Святой Дзевы Марыі ў в. Нача і інш.

У дадзеным артыкуле аўтар лічыць неабходным паказаць фактары, якія ўплывалі на цяперашні стан выяўленых матэрыялаў, акрэсліць відавую разнастайнасць парафіяльных крыніц, а таксама вылучыць іх асноўныя рысы ў кантэксце крыніцазнаўства.

Пры першасным аналізе памянёных комплексаў дакументаў вынікае, што адной з галоўных асаблівасцей з'яўляецца іх неаднародны якасна-колькасны склад. Так, напрыклад, у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішчална добра прадстаўлены інвентары, візітацыі і кнігі прадшлюбных экзаменаў, у сваю чаргу метрычныя кнігі амаль адсутнічаюць, а ў парафіі Уздзвіжання Святога Крыжа ў г. Ліда выдатна прадстаўлены комплекс метрычных брулёнаў, але амаль адсутнічаюць візітацыі, і г. д.

Такая неаднароднасць у колькасці захаваных асобнікаў гістарычных крыніц тлумачыцца, перадусім, стыхійнымі бедствамі, пажарамі і інш. Напрыклад, дакументы касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Струбніца захаваліся ў нешматлікіх пацярпелых ад агню справах (на сённяшні момант іх засталося толькі дзве. – *К. С.*), што дае магчымасці казаць аб тым, што касцельны архіў быў знішчаны пажарам. Нажаль, больш падрабязнымі звесткамі аб знішчэнні памянёных дакументаў аўтар не валодае. Такі ж інцыдэнт вядомы ў Ішчальнскім касцёле Найсвяцейшай Троіцы, дзе ў 1714 г. здарыўся вялікі пажар, які цалкам знішчыў касцельны архіў [5,

арк. 2]. Як вынікае з запісу ксяндза-пробашча Якуба Казіміра Пракаповіча, ён аднавіў некаторыя дакументы за 1712–1714 гг. па сваёй памяці [6, арк. 1].

Апроч таго, нельга не адзначыць фактар ваенных дзеянняў. Так, напрыклад, паводле звестак ксяндза Юзафа Шкопа, у 1914 г. у будынак Ляцкага касцёла Святога Станіслава трапіла выбуховае прыстасаванне, якое часткова панішчыла касцельныя вежы, аздабленне касцёла і бібліятэку з архівам [7, арк. 2], а ў памянёнай вышэй Ішчальнскай парафіі будынак касцёла і плябаніі падчас Першай сусветнай вайны быў заняты нямецкімі жаўнерамі, якія панішчылі аздабленне, арганы і, хучэй за ўсё, выкарысталі шэраг гістарычных крыніц на гаспадарчыя патрэбы [5, арк. 4].

Пазней, з аб'яднаннем Заходняй Беларусі з БССР, заходнебеларускім архіўным зборам быў нанесены значны ўрон – неналежны кантроль з боку мясцовых адміністрацый прывёў да шматлікіх фактаў знішчэння архіваў, бібліятэк, музейных фондаў часткамі Чырвонай Арміі і мясцовым насельніцтвам [8, с. 115]. Касцельныя дакументазборы напаткаў падобны лёс. Красамоўна ў дадзеным выпадку выглядае тое, што дакументы засталіся на захаванні толькі ў тых парафіях, якія не былі зачыненыя, або плябаніі якіх не былі канфіскаваныя ў ваенны і пасляваенны перыяд (у дадзеным выпадку на ўвазе маецца Другая сусветная вайна. – *К. С.*). Так, напрыклад, у 1952 г. у Слабадской парафіі ў Лідзе канфіскавалі плябанію на патрэбы школы, аргументуючы гэта тым, што на дадзены момант (снежань 1952 г. – *К. С.*) мясцовы ксёндз Казімір Баневіч знаходзіцца ў месцах адбыцця пакарання, таму будынак не выкарыстоўваецца і зарэгістраваны на касцельную абшчыну не быў [9, с. 35]. Дакументакомплекс з абазначанай парафіі знік. Такі ж лёс напаткаў і іншыя парафіі Лідскага, Шчучынскага, Іўеўскага і інш. дэканатаў, пры гэтым аўтар можа адзначыць, што ў дзяржаўных архівах комплексы дакументаў, якія гіпатэтычна павінны былі быць створанымі ў дадзеных культавых установах, на захаванні значацца толькі ў выглядзе кансісторскіх экзэмпляраў, адпаведна парафіяльныя крыніцы былі або схаванымі ў 1939–1990 гг., як, напрыклад, у касцёле Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі ў в. Вішнёва [1, с. 67], або знішчанымі, як, напрыклад, 905 тон разнастайных дакументаў, у тым ліку метрычных выпісаў, якія, паводле звестак вядомага беларускага гісторыка М. Ф. Шумейкі, былі перапрацаваныя ў верасні 1940 г. на другасную сыравіну на фабрыцы «Альбертын» [8, с. 120].

Апроч гэтага, калі верыць звесткам з інвентарных апісанняў, частка гістарычных крыніц была схаваная значна раней – у перыяд ціску на рымакаталіцкае духавенства пасля паўстання 1863 г. Так, напрыклад, у інвентары Лідскага Фарнага касцёла за 1888 г. адзначалася, што «…парафіяльны архіў быў страчаны…» [10, арк. 171], пры гэтым напрыканцы XX ст. дакументы за 1710–1887 гг. былі знойдзеныя на гарышчы.

Названыя вышэй факты некаторым чынам тлумачаць, чаму розныя парафіі Рыма-каталіцкага Касцёла на Беларусі назапасілі неаднародныя па сваім змесце комплексы гістарычных крыніц.

У сваю чаргу аўтар лічыць, што падобная неаднароднасць, нераўнамернасць, разрывістасць з'яўляюцца адной з тых рыс, якія робяць дадзеныя дакументы ўнікальнымі ў працэсах даследавання гісторыі Беларусі. У цэлым тут можна згадзіцца з думкай аднаго з французскіх філосафаў другой паловы ХХ ст. Ж. Дэлёза, які ў дачыненні да працэсаў назапашвання гістарычных крыніц і гістарычных ведаў (у яго тэрміналогіі – «выказванняў». – *К. С.*) адзначаў, што найбольшую каштоўнасць маюць толькі «выказванні», выражаныя ў выглядзе нераўнамернай «крывой» (тут бачыцца адсылка да рызомы. – *К. С.*) [11, с. 25].

Тым больш, нягледзячы на страты дакументальных помнікаў, прааналізаваныя дакументакомплексы, перадусім, дазваляюць акрэсліць відавую разнастайнасць крыніц па гісторыі Беларусі, якія захаваліся на дадзены момант у Рыма-каталіцкіх касцёлах.

Так, з усяго масіву гістарычных крыніц, якія знаходзяцца на захаванні ў парафіях за пачатак XVIII – канец ХХ ст., можна вылучыць наступныя групы:

1. Акты грамадзянскага стану, сярод якіх вылучаюцца парафіяльныя асобнікі метрык [6] (тут і далей спасылкі прыведзеныя на комплексы крыніц з 10–15 спраў паводле іх відавой прыналежнасці. – *К. С.*), кнігі прадшлюбных экзаменаў [12–13], метрычныя экстракты, а таксама бруліёны [14]. Па ацэнцы аўтара, дадзеная група крыніц з'яўляецца найбольш прадстаўленай у парафіяльных архівах. Так, вядома, што метрычныя кнігі вяліся ў чатырох асобніках – бруліёны, парафіяльныя, дэканальныя, кансісторскія. Цыркуляр НКУС ад 18.11.1919 патрабаваў ад усіх акружных аддзелаў органаў запісаў актаў грамадзянскага стану з архіваў былых духоўных кансісторый забраць у сваё вядзенне ўсе метрычныя кнігі і дакументы, якія іх суправаджаюць за перыяд з 1863 года і пазней [15, с. 56]. Аднак астатнія асобнікі метрычных кніг часткова засталіся на месцах. У працэсе даследавання дадзеных комплексаў дакументаў аўтар прыйшоў да вываду аб тым, што парафіяльныя і кансісторскія асобнікі метрычных кніг нельга лічыць адным тыпам крыніц – хучэй гэта адзін від, але прадстаўлены рознымі тыпамі.

Падобныя погляды выказваюць і вядомыя даследчыкі метрычных кніг Расіі Дз. Н. Антонаў і І. А. Антонава, якія праводзяць дакладную мяжу паміж кансісторскімі і іншымі асобнікамі метрык, гаворачы аб тым, што паводле інфарматыўнай змястоўнасці і формы (фармуляра. – *К. С.*) – гэта розныя віды гістарычных крыніц, датычных асобы [16, с. 48–50, 159].

2. Улікова-рэгістрацыйная дакументацыя, прадстаўленая ўсемажлівымі спісамі. Так, да іх можна аднесці спісы ўдзельнікаў Эўхарыстычных крыжовых шляхоў [17]; спісы парафіян [18], [19]; кнігі брацтваў [20]; спісы мужчын, народжаных у парафіі [21]; дакументы па міжканфесійных пераходах у ме-

жах парафіі і інш. Можна казаць аб добрай захаванасці дадзеных матэрыялаў у кожнай з парафій – так, напрыклад, дадзеныя спісы шырока прадстаўлены ў парафіяльных архівах у в. Ляцк, г. Шчучын, в. Ішчална, г. Ліда.

3. Крыніцы зямельна-гаспадарчага ўліку. Дадзеная група крыніц прадстаўленая, збольшага, інвентарамі, сярод якіх можна вызначыць інвентары перадачы парафіі ад старога пробашча новаму, інвентары фундушу парафіі, інвентары касцельных зямель, парафіяльныя асобнікі візітацый. Так, напрыклад, у Ляцкай парафіі захаваліся перадатачныя інвентары, у Лідзе і Ішчалне – комплексы інвентарных кніг і візітацый за 1710–1939 гг. [7], [10], [22], [23].

4. Матэрыялы перапіскі. У дадзеным выпадку сустракаецца перапіска як з вышэйстаячымі касцельнымі інстанцыямі [24], так і перапіска з цывільнымі ўладамі [25]. У савецкі перыяд з'яўляецца перапіска вернікаў з цывільнымі ўладамі на прадмет абмежавання правоў вернікаў з боку ўладаў. Так, напрыклад, добра захавалася перапіска жыхароў г. Шчучын з мясцовым выканкамам на прадмет вяртання мясцовай Рымска-каталіцкай абшчыне будынка касцёла Святой Тэрэзы Авільскай, канфіскаванага ў 1960-х гг. [26].

5. Фіскальныя дакументы. Дадзеная група крыніц асабліва добра захавалася за перыяд знаходжання заходняй часткі Беларусі ў складзе ІІ Рэчы Паспалітай. Яны дапамагаюць раскрыць гаспадарчую дзейнасць парафіі. Так, напрыклад, у Ішчальнскім касцёле захаваўся шэраг чэкаў, квітанцый, дамоў на аплату будаўнічых паслуг за перыяд 1925–1939, аналіз якіх дае магчымасць казаць аб тым, што парафія панесла матэрыяльныя страты падчас Савецка-польскай вайны і актыўна адбудоўвалася [27].

6. Гаспадарчыя дамовы. Дадзены від дакументаў адклаўся, перадусім, у савецкі час: так, з далучэннем Заходняй Беларусі да БССР у справаводстве парафій, якія разглядаюцца ў дадзеным артыкуле, пачалі з'яўляцца дамовы падраду з жыхарамі вакольных вёсак, дамовы з мясцовымі сельсаветамі на арганізацыю працы і перадачу касцельнай маёмасці ў арэнду вернікам і г. д. [тамсама].

7. Лакальныя хронікі і летапісы XX ст. У дадзеным выпадку аўтар прааналізаваў адну падобную крыніцу – хроніку Ішчальнскай парафіі, якая была напісаная ў 1936 г., але ахапіла перыяд за 1515–1936 гг., і з'яўляецца кампіляцыяй інвентароў, візітаў, статутаў брацтваў, а таксама ўласных успамінаў аўтара [28, с. 124]. Вядомыя, аднак, іншыя летапісы і хронікі за канец XIX – пачатак XX ст., але створаныя ва ўлонні праваслаўнай царквы на Беларусі, так, напрыклад – летапіс Ганчароўскай царквы (за 1887–1910 гг.) [29, с. 54] і інш. (усяго вядома каля 30 падобных крыніц. – *К. С.*), што дае падставы казаць аб традыцыях летапісання ва ўлонні хрысціянскай царквы ў абазначаны перыяд.

8. Эга-дакументы, пад якімі разумеюцца гістарычныя сведчанні, галоўнай рысай якіх з'яўляецца іх выразна акрэслены асабісты характар. Да дадзенай групы, перадусім, адносяцца мемуарныя крыніцы. Так, напры-

клад, у Лідскім Фарным касцёле захоўваюцца «Запісы аб Крыжы і капліцы ў Цвірмах» – успаміны Каноніка Ганаровага ксяндза Гіппаліта Баярунца за 1912–1936 гг. [30], таксама вядома аб існаванні ўспамінаў ксяндза Станіслава Каласанты Роэка. Яшчэ адным відам крыніц могуць з'яўляцца персанальныя мадлітоўнікі. Так, у тым жа Фарным касцёле захаваўся малітоўнік пробашча Міхала Зянкевіча (які з 1747 г. з'яўляўся Віленскім біскупам. – *К. С.*) з заўвагамі на палях, персанальнымі пазнакамі і г. д.

Натуральна, дадзенае групаванне гістарычных крыніц з'яўляецца абагульненым і можа ўтрымліваць пэўны працэнт пагрэшнасці. Карыснасць гэтай аперацыі заключаецца ў тым, што яна дае агульнае прадстаўленне аб крыніцазнаўчай вартасці крыніц парафіяльных архіваў і дае прадстаўленне аб тым, у якіх кірунках гістарычнай навукі можна выкарыстоўваць дадзеныя дакументы.

Такім чынам, падводзячы вынікі даследавання, на падставе першаснай класіфікацыі гістарычных крыніц, а таксама аналізу ўмоў іх стварэння і, можна вылучыць наступныя рысы, уласцівыя дакументам парафіяльных архіваў Рыма-каталіцкага Касцёла на Беларусі ў кантэксце крыніцазнаўства:

1. Неаднароднасць колькасна-якасных паказчыкаў захаваных гістарычных крыніц.

2. Пры параўнальным аналізе гістарычных крыніц, якія знаходзяцца на захаванні ў парафіях, мы можам казаць аб відавым падабенстве комплексаў дакументаў.

3. Абсалютная большасць крыніц змяшчае інфармацыю, датычную асобы.

4. Мікрагістарычнасць і паўсядзённасць з'яў, якія фіксуюцца ў гістарычных крыніцах. Абсалютная большасць з іх утрымлівае звесткі, якія датычацца невялікіх па памерах лакацый, звычайна не большых за парафію.

5. Іманентнасць гістарычных крыніц, якая вынікае з папярэдняга пункту. Дадзены аспект характарызуе моцную ўнутраную сувязь прадмета, які знаходзіцца ў самым сабе, не пераходзячы ў знешнія катэгорыі. Крыніцы парафіяльных архіваў фіксуюць толькі факты з парафіяльнага жыцця, фактычна прадстаўляючы парафію як пэўную адносна закрытую, закальцаваную на самой сабе сукупнасць вернікаў, якія кампактна пражываюць на пэўнай тэрыторыі.

6. Наяўнасць вялікай колькасці дублетнай інфармацыі ў гістарычных крыніцах. Так, комплексы метрычных кніг прадстаўленыя чатырма экзэмплярамі – брулёны, парафіяльныя, дэканальныя, кансісторскія. У сваю чаргу інвентарныя апісанні парафій былі прадстаўленыя трыма асобнікамі – візітацыяй, дэканальным, парафіяльным і г. д.

Дадзеныя рысы, уласцівыя крыніцам парафіяльных архіваў Рымска-каталіцкага Касцёла на Беларусі, робяць іх каштоўнай крыніцай, перадусім, па мікрагісторыі, гісторыі паўсядзённасці, гісторыі асобы, канфесійнай гісторыі. У сваю чаргу неаднароднасць якасна-колькаснага складу

дакументаў гаворыць аб неабходнасці іх выкарыстання ў звязцы з іншымі крыніцамі па гісторыі Беларусі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Лісейчыкаў, Дз. В.* Сенсацыйная знаходка ў мурах Вішнеўскага касцёла / Дз. В. Лісейчыкаў // Архивы и делопроизводство. – 2015. – № 5. – С. 67–71.

2. *Лісейчыкаў, Дз. В.* Архівісты ўпершыню вызначылі сапраўднасць і апісалі дакументы архіва праваслаўнага храма / Дз. В. Лісейчыкаў // Архивы и делопроизводство. – 2014. – № 1. – С. 97–104.

3. *Сыцько, К. В.* Архівы рыма-каталіцкіх парафій Заходняй Беларусі XIX – першай паловы XX ст. (на прыкладзе архіва касцёла Найсвяцейшай Троіцы ў в. Ішчална) / К. В. Сыцько // Теоретические и практические проблемы документоведения и архивоведения: ретроспектива и современность: материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2–3 дек. 2015 г. / БЕЛНИИДАД; редкол.: Э. М. Савицкий [и др.]. – Минск, 2016. – С. 173–181.

4. *Сыцько, К. В.* Метрычныя кнігі Ішчалнскай парафіі як крыніца ведаў па гісторыі Лідчыны / К. В. Сыцько // Лідскі летапісец. – 2012. – № 4(56). – С. 29–42.

5. Архіў касцёла Найсвяцейшай Троіцы в. Ішчална. – Спр. б/н. Kronica Kościelna, 1936 г.

6. Архіў касцёла Найсвяцейшай Троіцы ў в. Ішчална. – Спр. б/н Chrzest i szluby, 1713 – 1796 гг.

7. Архіў касцёла Святога Станіслава. – Спр. б/н Inwentarz Kościola Łackiego dane od dnia ... kwietnia, 1936 r.

8. *Шумейко, М. Ф.* Сентябрь 1939 г года в судьбе белорусских архивов / М. Ф. Шумейко // Архивы и делопроизводство. – 2009. – № 5. – С. 113 – 121.

9. *Суднік, С. В.* Пра лёс Слабадской плябаніі ў г. Лідзе / С. В. Суднік // Лідскі летапісец. – 2015. – № 4 (72). – С. 32 – 35.

10. Архіў Лідскага Фарнага касцёла. – Спр. б/н Інвентары і візітацыі, 1710–1889 гг.

11. *Делёз, Ж.* Фуко / Ж. Делёз. – М.: Изд-во гуманитар. лит., 1998. – 172 с.

12. Архіў касцёла Найсвяцейшай Троіцы ў в. Ішчална: у 6 т. – Спр. б/н Кнігі прадшлюбных экзаменаў, 1834–1945 гг.

13. Архіў касцёла Найсвяцейшай Тройцы в. Струбніца. – Спр. б/н. Кнігі прадшлюбных экзаменаў, 1893–1919 гг.

14. Архіў Лідскага Фарнага касцёла – Спр. б/н. Метрычныя брулёны, 1919–1989 гг.

15. *Елпатьевский, А. В.* К истории документирования актов гражданского состояния в России и СССР / А. В. Елпатьевский // Актовое источниковедение: сб. ст. / Ин-т истории СССР; редкол.: С. М. Каштанов (отв. ред.) [и др.]. – М., 1979. – С. 55–59.

16. *Антонов, Д. Н.* Метрические книги России XVIII – начала XX вв. / Д. Н. Антонов, И. А. Антонова. – М.: РГГУ, 2006. – 194 с.

17. Архіў касцёла Святой Тэрэзы Авільскай г. Шчучын. – Спр. б/н. Główna Księga Krzecjaty Eucharystycznej Rycerek, 1936–1937 гг.

18. Архіў касцёла Найсвяцейшай Троіцы в. Ішчална. – Спр. б/н. Spis ludności Parafii Izszczołnskiej Rzymsko-Katolickiego Wyznania w Roku 1843 Miesiącu Styczniu, 1843 г.

19. Архіў касцёла Святога Станіслава ў в. Ляцк. – Спр. б/н Приходской списокъ Лядского Приходского Римско-Католического костёла, 1909 г.

20. Архіў касцёла Святой Тэрэзы Авільскай г. Шчучын. – Спр. б/н. Liber cui Inscribuntur Suffragania Consueta pro Kostras, 1789 г.

21. Архіў Лідскага Фарнага касцёла. – Спр. б/н. Спіс асоб мужчынскага полу, народжаных у парафіі, 1920 г.

22. Архіў касцёла Найсвяцейшай Троіцы ў в. Ішчална. – Спр. б/н Інвентары і візітацыі, 1717–1888 гг.

23. Архіў касцёла Найсвяцейшай Тройцы в. Струбніца. – Спр. б/н. Візітацыі, 1844–861 гг.

24. Архіў касцёла Найсвяцейшай Троіцы в. Ішчална. – Спр. б/н. Akta kościelne, 1836–1854 гг.; 1929–1982 гг.
25. Архіў касцёла Найсвяцейшай Троіцы в. Ішчална. – Спр. б/н. Akta rządowe, 1846–1868 гг.
26. Архіў касцёла Святой Тэрэзы Авільскай г. Шчучын. – Спр. б/н. Дакументы за савецкі перыяд у россыпу, 1860–1991 гг.
27. Архіў касцёла Найсвяцейшай Троіцы в. Ішчална. – Спр. б/н. Rachunki kościelne, 1924–1937 гг.
28. *Сыцько, К. В.* Паміж цывільным і рэлігійным: да пытання адлюстравання гістарычнай рэальнасці ў наратыўных крыніцах 30-х гг. ХХ ст. (на прыкладзе крыніц па гісторыі Лідскага дэканата) / К. В. Сыцько // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2016. – tom 45. – С. 115–140.
29. *Кунцэвіч, А. А.* Архіў Лідскага дабрачыння / А. А. Кунцэвіч // Лідскі летапісец. – 2013. – № 3(63). – С. 27–65.
30. *Boyarunets, H.* Zapisy o Krzyży i Kaplicy w Cwiermah / H. Boyarunets. – Lida: з дакументаў Лідскага Фарнага касцёла Узвышэння Святога Крыжа, 1936. – 50 с.

**(Дата падачы: 02.02.2017 г.)**

*С. В. Телепень*
Мозырьский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякин, Мозырь

*S. Telepen*
Mozyr State Pedagogical University named after I. P. Shamyakin, Mozyr

**УДК 342.5(091)(045)**

# ВОЕННАЯ И АДМИНИСТРАТИВНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КАК ФАКТОР ИДЕНТИЧНОСТИ НОБИЛИТЕТА РИМСКОЙ ИМПЕРИИ

# MILITARY AND ADMINISTRATIVE ACTIVITY AS THE FACTOR OF NOBILITY IDENTITY OF ROMAN EMPIRE

*Статья исследует роль военной и административной деятельности в системе ценностей римского нобилитета, значение следования этим ценностным установкам для поддержания авторитета и приобретения власти в Римской империи. Делается вывод об обусловленности аристократической идентичности соблюдением кодекса поведения успешного управленца.*

*Ключевые слова: принципат; императорская власть; императорские легаты; военные трибуны; аристократия; нобилитет; всадничество*

*The article examines the role of the military and administration in the system of values of the Roman nobility, the meaning of this value system follow for maintaining the authority and power gain in the Roman Empire. The conclusion is about the conditionality of aristocratic identity compliance with the code of conduct a successful official.*

*Key words: Principate; Imperial Power; Imperial legates; military tribunes; aristocracy; nobility; equites.*